тему “Вопросы этнологии и фольклористики” с предоставлением материалов экспедиций в отдаленные районы Краснодарского края. На факультете искусств представлены студенческие работы в рамках конференции “Музыкальная культура Кубани”. Особый интерес представляют разработки, связанные с музыкально-педагогическим образованием на Кубани, проблемами музыкального просветительства, творчеством разных поколений композиторов Кубани.

Большая часть практических занятий, курсовых, дипломных и научных работ ориентирована на реальные потребности отрасли, которую представляет вуз. Многие студенческие курсовые, дипломные и научные работы выполняются по социальному заказу органов управления, Центра национальных культур Кубани, Союза композиторов, библиотек, информационных служб.

***Шумская І.М.**, аспірантка*

## АКТЫВІЗАЦЫЯ ТВОРЧАГА МЫСЛЕННЯ ЯК НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ПРАФЕСІЙНАГА СТАНАЎЛЕННЯ АСОБЫ

Асаблівасці сучаснай эпохі, дынамічныя змены ў грамадскім жыцці патрабуюць ад нас перагляду мноства аспектаў працэсу адукацыі і выхавання на ўсіх яго ступенях. На працягу доўгіх гадоў падрыхтоўка спецыялістаў вялася шляхам перадачы ім назапашаных ведаў. Аднак варта мець на ўвазе, што адукацыя – гэта не толькі спосаб трансляцыі пэўнага аб'ёму інфармацыі, але і частка культуры.

Агульнавядома, што ўзровень цывілізаванасці кожнай дзяржавы ў значнай меры вызначаецца магутнасцю “інтэлекту нацыі”. Адукаваны чалавек – гэта ў першую чаргу асоба, шырокі спектр духоўных і інфармацыйных патрэб якой немагчыма цалкам задаволіць праз традыцыйныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формы навучання. Таму ў новай адукацыйнай сістэме вядучымі павінны зрабіцца не уніфікаваныя, а індывідуалізаваныя запыты, якія фарміруюцца ў адказ на праблемныя жыццёвыя сітуацыі.

Відавочна, што вырашаць пытанні павышэння прэстыжнасці прафесійнай адукацыі і канкурэнтаздольнасці спецыяліста немагчыма без пэўных змяненняў у адукацыйнай сістэме. Адным з такіх змяненняў павінна стаць акцэнтаванне ўвагі на развіцці творчага мыслення асобы, бо эфектыўнасць прафесійнай адукацыі, як, зрэшты, і адукацыі ў цэлым, непасрэдна залежыць ад наяўнасці ў ёй элементаў творчасці.

Творчы працэс, з аднаго боку, абумоўлены аб'ектыўным становішчам, якое часта патрабуе ад чалавека нетыповых рашэнняў жыццёва важных задач, а з другога боку, суб'ектыўнымі фактарамі, да якіх адносіцца матывацыйная сфера асобы. Пры гэтым знешняя матывацыя можа служыць рухавіком творчай актыўнасці толькі пры дапамозе ўнутранай, бо на ўсе перавагі, што выступаюць у якасці знешніх матываў (слава, грошы, кар'ера і г.д.), чалавек можа разлічваць толькі пасля таго, як вырашэнне задачы прынесла свой плён.

Фундаментам прафесійнай падрыхтоўкі, здольнай спалучаць у сабе тэарэтычнае і практычнае навучанне, з'яўляюцца кампетэнтнасць выкладчыкаў і сістэмны падыход у засваенні ведаў, якія абавязаны садзейнічаць рэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці творчага мыслення. Таксама важную ролю ў працэсе адукацыі выконваюць разнастайныя віды псіхолага-педагагічных эксперыментаў, якія дазваляюць больш поўна высвятліць індывідуальныя характарыстыкі будучых спецыялістаў.

Фарміраванне творчага мыслення непасрэдна звязана з няспыннай работай думкі, характэрнай для творчай асобы, а таксама з асаблівасцямі прафесіі. Яно залежыць ад такіх этапаў мыслення, як успрыманне інфармацыі, яе аналіз і перапрацоўка, памяць, прафесійнае мысленне. Кожны з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вышэйзгаданых прыёмаў важны для іх развіцця і ўзаемадзеяння паміж сабой.

Дзеля таго каб успрыманне ведаў было эфектыўным, патрабуецца арыентацыя на важнасць вывучаемага матэрыялу і перспектыву яго выкарыстання ў будучай прафесійнай дзейнасці. Гэта значыць, што выкладчык павінен мець дакладна сфармуляваныя мэты пазнавальнай дзейнасці. Каб больш трывала засвоіць тую ці іншую інфармацыю, трэба актуалізаваць веды, якія ўжо ёсць у наяўнасці, і суаднесці іх з новымі.

Варта памятаць аб тым, што ў творчай думкі шмат ворагаў, сярод якіх дагматычнасць, дэтэрмінізм, падаўленне ўсякіх эмоцый, жорсткая і зневажальная крытыка. Акрамя таго, пры адсутнасці глыбіннай цікавасці да вывучаемых дысцыплін немагчыма разлічваць на добрую паспяховасць. Індывід, які вучыцца ў рэжыме няспыннага пошуку і адкрыцця, здольны авалодаць такімі відамі і спосабамі дзейнасці, якія фарміруюць яго асобу, садзейнічаюць духоўнаму росту і прафесійнаму станаўленню. Улічваючы гэта, выкладчык павінен імкнуцца як мага больш удасканальваць вучэбны працэс і сваё майстэрства з улікам індывідуальных памкненняў і творчых здольнасцей студэнтаў. Апошнія могуць у поўнай меры рэалізавацца толькі ў тым выпадку, калі чалавек адчувае сваю адпаведнасць таму сацыяльнаму асяроддзю, у якім ён знаходзіцца, той дзейнасці, якой ён займаецца, і вырашэнню тых задач, якія паўстаюць перад ім у працэсе прафесійнага станаўлення.

Такім чынам, для сучаснай вышэйшай школы, бадай, галоўнай праблемай з'яўляецца стварэнне асаблівай атмасферы, якая б спрыяла найбольш поўнаму раскрыццю і далейшаму развіццю індывідуальнага таленту.

Даволі востра цяпер стаіць пытанне павышэння эфектыўнасці завочнага навучання. У адрозненне ад студэнтаў стацыянара, якія знаходзяцца ў пастаянным кантакце з выкладчыкамі і аднакурснікамі і маюць больш магчымасцей для праверкі атрыманых ведаў, студэнты-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

завочнікі ў асноўным працуюць самастойна. Таму актывізацыя іх творчага патэнцыялу з'яўляецца актуальнай задачай айчыннай адукацыйнай сістэмы. У сувязі з гэтым варта звярнуць увагу на наступныя рэчы: па-першае, адпаведнасць прафесійнай дзейнасці профілю навучання, па-другое, патрэба стымулявання індывідуальнай зацікаўленасці асобы ў выкананні тых ці іншых вучэбных заданняў, па-трэцяе, самі выкладчыкі абавязаны быць кампетэнтнымі спецыялістамі з трывалымі ведамі псіхалогіі, філасофіі, культуралогіі, этыкі, ім трэба ўлічваць змены, якія адбываюцца ў свеце, і ўспрымаць студэнта "не як ёмістасць, якую неабходна напоўніць, а як паходню, якую трэба запаліць".

У студэнта павінны быць свае правы: права на памылкі, права быць выслуханым і прынятым усур'ёз, права на прызнанне, права на свой пункт погляду, права на выбар альтэрнатыўных рашэнняў. У працэсе навучання важна ўсталяваць такія адносіны паміж выкладчыкам і студэнтамі, якія захоўвалі б іх псіхічную раўнавагу і падтрымлівалі дух партнёрства і супрацоўніцтва, а пазнанне ператваралі б у творчы акт. Пры гэтым трэба ўлічваць, што выдатным стымулятарам тут з'яўляецца арыентацыя на поспех. Творчыя патрэбы больш глыбока раскрываюцца ў працэсе фарміравання пачуцця ўласнай годнасці, таму ніколі не варта падтрымліваць у студэнта перакананне ў тым, што ён быццам бы няўдачнік.

У краінах Захаду шырока распаўсюджана ўжыванне такога паняцця, як "self-made-man", што ў перакладзе азначае "чалавек, які сам сябе зрабіў". Інакш кажучы, тут маецца на ўвазе мадэль асобы, якая валодае высокім патэнцыялам самарэалізацыі і здольная дасягаць значнага поспеху ў жыцці шляхам уласных намаганняў, без асаблівай дапамогі з боку іншых.

Абрахам Маслоў адзначаў, што такія асобы ўяўляюць сабой узор максімальнага адлюстравання чалавечай сутнасці. Ён вылучаў 15 асноўных характэрных рыс, уласцівых такім людзям. Гэта:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1) свабода ад прымхаў і забабонаў, цікавасць да нязведанага, высокая адэкватнасць успрымання рэчаіснасці;

2) прыманне сябе такімі, якія ёсць, адсутнасць штучных форм паводзін і негатыўная ацэнка такіх паводзін у дачыненні да астатніх;

3) імпульсіўнасць у праяўленні эмоцый, натуральнасць і прастата;

4) дзелавая скіраванасць, занятасць не сабой, а сваёй жыццёвай задачай;

5) схільнасць да адзіноты і разваг;

6) аўтаномія і незалежнасць ад навакольнага асяроддзя;

7) свежасць успрымання;

8) хваравітыя адносіны да ўласнага Я;

9) пачуццё агульнасці з чалавецтвам у цэлым;

10) сяброўства з аднадумцамі;

11) дэмакратычнасць, гатоўнасць вучыцца ў іншых;

12) устойлівыя ўнутраныя маральныя нормы;

13) філасофскае пачуццё гумару;

14) крытычныя і неадназначныя адносіны да культуры або да той культурнай прасторы, у якой яны існуюць;

15) крэатыўнасць ва ўсіх відах дзейнасці.

Сукупнасць усіх вышэйзгаданых рыс з'яўляецца досыць дакладным партрэтам сапраўднай творчай асобы, якая не проста рэалізуе сябе ў адным ці некалькіх відах мастацтва, а ў першую чаргу знаходзіць сваё месца ў рэальным жыцці.

Калі сучасная сістэма адукацыі возьме пад увагу стымуляванне развіцця ў навучэнцаў дадзеных якасцей, то ўзровень эфектыўнасці засваення як агульных, так і прафесійных ведаў значна ўзрасце.

Трэба адзначыць, што механізмы інтэлектуальнай творчай дзейнасці па сутнасці адны і тыя ж, незалежна ад канкрэтнай прыроды аб'екта творчасці. Адрозненне паміж навуковай і мастацкай творчасцю заключаецца толькі ў тым, што стварэнне новага ажыццяўляецца ў другім выпадку ў рамках эмацыянальнай сістэмы мастацтва. Такі падыход

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значна павялічвае маштабы творчасці, ён звязаны з эстэтычным бокам працэсу стварэння. Эстэтычнае стала неад'емнай часткай новай прадукцыі творчай дзейнасці чалавека. Эстэтычнае пачуццё – адзін з фактараў матывацыі творчасці, у тым ліку і ў навуковай працы.

У цяперашні час больш, чым калі-небудзь раней, ёсць неабходнасць у высокаадукаваных спецыялістах, здольных выйсці за рамкі традыцыйнага мыслення і раскрыць сябе ў творчым імпэце. Чалавек, які можа творча падыходзіць да вырашэння прафесійных задач, рэалізуе пры гэтым і сваю стратэгію, і стратэгію паводзін, і стратэгію жыцця.

Адукацыі належыць выкананне адказных функцый: рыхтаваць чалавека да жыцця і ўзнаўляць " высокія веды", трасфармаваць агульначалавечыя і нацыянальныя культурныя каштоўнасці на ўзровень індывіда. На парозе новага тысячагоддзя нам неабходна ажыццявіць чарговую пераацэнку каштоўнасцей, адмовіцца ад шаблоннага ўспрымання існуючых рэалій і выпрацаваць у сабе сапраўды творчыя адносіны да жыцця.

***Шырокава В.І., дацэнт***

## РОЛЯ КУРСА АРКЕСТРАВАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ КІРАЎНІКОЎ АРКЕСТРАЎ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Лекцыйны курс аркестравай літаратуры чытаюць студэнтам Беларускага універсітэта культуры нядаўна. Увядзенне гэтага курса ў навучальны план абумоўлена спробай палепшыць якасць падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў аркестраў народных інструментаў.

Заўважана: студэнты, што заканчваюць ВНУ культуры, атрымліваюць добрую дырыжорскую падрыхтоўку, але ў прафесійнай дзейнасці сутыкаюцца з цяжка вырашальнымі пытаннямі: дзе ўзяць рэпертуар, якая нотная